# СТАНОВІШЧА ЕЗУІТАЎ І БАЗЫЛЬЯН НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ: АГУЛЬНАЕ І АДМЕТНАЕ

***К.Я. Алесік***
Навуковы кіраўнік – к.гіст.н. ***І.Э. Яленская***
*Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна*

Мэтай даследавання з’яўляецца аналіз і параўнанне становішча ордэнаў езуітаў і базыльян ў Беларусі перыяду Расійскай імперыі, высвятленне фактараў, якія абумовілі палітыку расійскіх улад у адносінах да езуітаў і базыльян. Царква на далучаных да Расійскай дзяржавы землях была сродкам палітычнай барацьбы, а рэлігійныя пытанні атаясамліваліся ў вышэйшых колах з палітычнымі. Асобную ўвагу расійскіх улад прыцягвалі два ордэны – езуітаў і базыльян. Гэта тлумачылася аб’ектыўнымі прычынамі:

1. Моцная матэрыяльная база: у 1773 г. маёмасць езуітаў у ВКЛ складала 550 тыс. га зямлі і 47 610 прыгонных сялян, 80 % маёмасці знаходзілася на тэрыторыі Беларусі [2, с. 3]. Маёмасць базыльянаў, па звестках на 1823-24 гг., складалася з 83 манастыроў (688 манахаў), 11 435 сялян і 858 152 руб серабром [1, с. 614].
2. Два гэтыя ордэны займаліся актыўнай асветніцкай дзейнасцю. На далучанай да Расіі тэрыторыі знаходзіліся 6 калегіумаў. Базыльяне утрымлівалі 28 школ [4, с. 198].
3. Кіраўнікі ордэнаў знаходзіліся на тэрыторыях, якія ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі.

Палітыка расійскіх улад была накіравана на ўзмацненне ордэна езуітаў і паслабленне пазіцый ордэна базыльян. У 1795 г., калі на тэрыторыі Расійскай імперыі апынулася ўсё кіраўніцтва ордэна базыльян, уладамі былі скасаваны пасады протаархімандрыта і протаігумена, іх функцыі былі перададзены мітрапаліту Лісоўскаму. Такі ж накірунак палітыкі быў у адносінах да матэрыяльнай маёмасці базыльян [5, с. 14]. У адносінах да езуітаў палітыка расійскіх улад мела не толькі лаяльны, а нават спрыяльны характар. 30.08.1777 г. выйшаў указ аб будаўніцтве ў Полацку навіцыята і аб дазволе на прыезд у Беларусь экс-езуітаў з Заходняй Еўропы. Гэтыя мерапрыемствы забяспечвалі не толькі захаванне ордэну, але і хуткі колькасны рост: 1785 г. – 172-179 езуітаў, 1778 г. – 196, 1820 г. – 358 [3, с. 42].

У сваёй палітыцы расійскія ўлады ўлічвалі патэнцыял абодвух ордэнаў, але сваю палітыку будавалі на тых фактарах, якія адрознівалі іх. Па-першае, езуіты прадстаўлялі рэлігійную меншасць Беларусі, у склад якой уваходзіла асноўная частка ўплывовых колаў насельніцтва. А базыльяне былі вядучым звяном канфесіі, да якой належала абсалютная большасць насельніцтва Беларусі. Па-другое, рознымі былі ўзаемаадносіны ордэнаў з Ватыканам: папа рымскі імкнуўся да поўнай ліквідацыі ордэна езуітаў і актыўна падтрымліваў базыльян. Па-трэцяе, рознымі былі пазіцыі, якія занялі ордэны ў адносінах да расійскіх улад: езуіты прынеслі прысягу на вернасць адным з першых, базыльяне ж нейкі час адмаўляліся.

Езуітаў і базыльян спасціг аднолькавы лёс на беларускіх землях – ордэны былі скасаваныя. Аднак вынікі ліквідацыі ордэнаў былі розныя: выгнанне езуітаў не адбілася на становішчы каталіцкай царквы у значнай ступені, у той час, як знішчэнне ордэна базыльян было, па сутнасці, прысудам уніяцкай царкве.

**Літаратура**

1. Акты издаваемые Археографическою комиссиею высочайше учрежденною в Вильне. – Вильна, 1867. – Т. 16.
2. Блинова Т. Иезуиты в Белоруссии. – Мн., 1990.
3. Ганчарук І. Палітыка царызму ў адносінах да каталіцкай царквы (1772-1830 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. – 2002. – №1. С. 39-47.
4. Киприанович Г.Я. Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве. – Вильно, 1899.
5. Radwan M. Carat wobee kościoła greckokatolickiego wzabrze rosyjskim. – Roma-Lublin, 2001.